Вс 50961
84(4Беи)6
П32

# Піншчына
## літаратурная



1Б050061

84(4Бен)6
П32

# Піншчына
## *літаратурная*

**Вершы**
**Проза**

ПАДОРАНА
Брэсцкай абласной бібліятэцы
імя А. М. Горкага
Пінскай ЦГБ

«Пінскі веснік»
1999

УДК [882.6+882]—8(082)
ББК 84(4Беи)6+84(2Рос=Рус)6
П 32

РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:
*У.С.Федаровіч (старшыня), М.І.Ляшук,*
*І.Д.Чараўко, Н.І.Білютавічэне, А.І.Шушко, В.І.Локун.*

РЭДКАЛЕГІЯ:
**М.І.Ляшук** (галоўны рэдактар)
**І.Д.Чараўко**
**М.М.Самуйлік**
**В.І.Локун**

*Кніга выдадзена ў рамках рэспубліканскага свята — Дня беларускай пісьменнасці пры фінансавай падтрымцы Пінскага гарадскога выканаўчага камітэта і Дзяржаўнага камітэта па друку Рэспублікі Беларусь.*

БРЭСЦКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ М. ГОРЬКАГА

ISBN 985-6497-10-8 © Рэдакцыя газеты «Пінскі веснік», 199



# ПРАДМОВА

*Палескі край — гэта край адметны. Ён адметны не толькі светам прыродным, велічным і таямнічым, не толькі гісторыяй, старажытнай і годнай, але найперш культурай. Тут усё непаўторнае — звычаі, абрады, паданні, песні, «стыль паводзін» і свядомасць чалавека. Бо ўсё гэта нараджалася і акумулявалася ў лучнасці чалавека з акаляючым светам. «Загадка» палешука, «загадка» палескага краю — над гэтым біліся даўно і розныя слынныя асобы. Згадваюцца тыя, што ўжо стаяць бліжэй да нас: Ф.Дастаеўскі, А.Купрын, А.Блок, А.Пашкевіч (Цётка), Я.Колас, М.Гарэцкі. І зусім ужо блізкія: І.Мележ, У.Караткевіч. Праз усю нацыянальную літаратуру «праходзіць» дыялог беларусаў Васіля Дзятліка і Ганны Чарнушкі. Ды хіба праз нацыянальную толькі? Іх галасы даўно выйшлі на прасцягі літаратуры сусветнай — праз сваю шчырасць і праўду, бо ў гэтай асобнай і канкрэтнай шчырасці і праўдзе ўвасобіліся шчырасць і праўда ўсяго людства на свеце. І таго, што было раней, і таго, што будзе жыць пасля нас. Менавіта праз «я» палешука, праз непаўторную прыроду паляшуцкую, якая з'яўляецца мастацкім эквівалентам высокай духоўнасці чалавека, размаўляла са светам і незабыўная Яўгенія Янішчыц. Размаўляла і працягвае размову Валянціна Коўтун...*

*І суцешна, што такі дыялог становіцца ўжо несупынным. Аб гэтым сведчаць і галасы, што сабраны ў гэтым зборніку. Галасы розныя па гучнасці, па ўзроўню мастацкасці. І гэта зразумела. Бо тут суседнічаюць розныя аўтары: і тыя, што займаюцца літаратурай стала, прафесійна, і тыя, для якіх творчасць — прага душы, унутранае запатрабаванне. Розныя стылі, розныя жанры, але кожны з аўтараў — і сталы па ўзросту, і зусім малады — імкнецца сказаць нешта сваё, запаветнае, тое, што яго найбольш хвалюе, уражвае, што трывожыць яго розум і сэрца. Усе яны занепакоена глядзяць на свет і чалавека ў ім.*

*Гэта першы вопыт збору талентаў літаратурнай Піншчыны. Але хочацца спадзявацца, што будзе і другі, і трэці...*

**Валянціна ЛОКУН,**
**кандыдат філалагічных навук.**